# РЕЛИГИЯ, СВОБОДА СОВЕСТИ, ГОСУДАРСТВЕННО-КОНФЕССИОНАЛЬНЫЕ ОТНОШЕНИЯ

УДК 94 (476)

**А.Р. Агееў** (*г. Магілёў, Беларусь*)

## РЭЛІГІЙНАЕ ПЫТАННЕ НА ПАСЛЯВАЕННЫХ З'ЕЗДАХ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

Стэнаграмы з'ездаў КПБ 40-60-х гадоў цікавыя гістарычныя дакументы. Нягледзячы на ўслаўленне ў дакладах і выступленнях дзейнасці камуністычнай партыі, шаблоннасць многіх выступленняў, яны дазваляюць адчуць дух эпохі, яе асноўныя праблемы, убачыць мноства іншых аспектаў жыцця тагачаснага грамадства. На гэтых партыйных форумах абмяркоўваліся і пытанні рэлігійнага жыцця ў БССР, хаця, трэба адразу адзначыць, што яны ніколі на пасляваенных з'ездах не былі галоўнымі.

Пасля перапынку ў дзевяць гадоў у лютым 1949 г. адбыўся XIX з'езд кампартыі Беларусі. І ў справаздачным дакладзе, і ў выступленнях шмат увагі ўдзялялася пытанням ідэалагічнай работы, неабходнасці барацьбы з касмапалітызмам, буржуазнай ідэалогіяй, часткай якой разумелі і рэлігійныя вераванні. Бальшавікі бачылі ў царкве ідэалагічнага канкурэнта. Узгадванне служкаў культу на з'ездзе адбывалася толькі ў негатыўным кантэксце і, як правіла, у пераліку ворагаў савецкай улады. Так, міністр дзяржбяспекі Цанава Л.Ф. у сваім выступленні адзначыў, што "многие руководители Западных областей жалуются на сопротивление в колхозном строительстве агентов иностранных разведок, буржуазных националистов, кулаки, католическое духовенство, сектанты и другие враждебные советской власти элементы" і прапанаваў іх выкрываць. [1, л. 247]

Прэзідэнт Акадэміі навук Грыцанкоў доўга і грунтоўна разважаў аб "низкопоклонстве перед буржуазной наукой и культурой", аб неабходнасці бязлітаснай барацьбы з "политическими уродами" – мендэлістамі-марганістамі. Напрыканцы свайго выступлення ён рэкамендаваў накіраваць сілы нашай інтэлігенцыі на барацьбу з касмапалітызмам і асаблівую ўвагу – на выкрыццё касмапалітычных тэорый каталіцызму, які абвешчаны Ватыканам духоўным цэнтрам свету [1, л. 352, 373, 376].

Падобным чынам былі расстаўлены акцэнты на XX у 1952 г. і на XXI у 1954 г. з'ездах КПБ. На іх камуністаў больш хвалявалі змены ў курсе партыі ў пасясталінскі час. Тым не менш, партыйцаў турбавала і рэлігійнасць жыхароў Заходняй Беларусі, што цалкам натуральна было звязана з адносна кароткім знаходжаннем ў складзе Савецкай краіны. У выступленнях дэлегатаў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гэтых рэгіёнаў час ад часу выказвалася трывога з гэтай нагоды. Найбольш клапаціла ў гэтыя гады партыйных чыноўнікаў менавіта дзейнасць каталіцкай царквы, само падпарадкаванне якой Ватыкану аўтаматычна ставіла яе пад падазрэнне, і актыўнасць "сектантаў". Праваслаўная царква, якая афіцыйна адрадзілася ў СССР у 1943 г., яшчэ, відаць, не ўяўлялася настолькі небяспечнай.

Яскрава такі падыход бачны ў выступленні сакратара ЦК КПБ Гарбуноў на XXII з'ездзе партыі, які адбыўся ў студзені 1956 г. У дэбатах па дакладзе Першага сакратара ЦК КПБ таварыша Патолічава слова ўзяў і Гарбуноў, які прааналізаваў стан ідэалагічнай работы ў рэспубліцы. Сярод яе недахопаў ён адзначыў нездавальняючую пастаноўку навукова-атэістычнай работы. "Вследствие того что Белоруссия долгое время находилась под иноземным игом, католичество, как известно, проникло в западные области. Наша партия чутко относится к чувствам трудящихся, а некоторые работники поняли это как новую линию партии по отношению к религии... Уполномоченный по делам религиозных культов при совете министров т. Уласевич взял курс на расширение сети костелов... и добился некоторых (зачеркнуто "довольно больших". – аўт.) успехов благодаря нашему попустительству". "Он даже поставил вопрос об открытии костелов в Минской, Витебской, Могилевской, Гомельской области, хотя в восточных областях костелов нет больше 30 лет, поставил вопрос о создании в Минске католического центра во главе с епископом. Бюро ЦК остановило его, не согласилось и освободило его от обязанностей уполномоченного..." [2, л. 302,304] Так на з'ездзе, была падведзена рыса пад перыядам пэўнай лібералізацыі ў правядзенні рэлігійнай палітыцы ў БССР.

У 1959-61 гг. з'езды партыі адбываліся штогод. Нечарговы XXIII з'езд КПБ праходзіў 14-15 студзеня 1959 г. У дакладзе Першага сакратара ЦК КПБ таварыша Мазурава, як звычайна, падкрэслівалася важнасць антырэлігійнай прапаганды. На XXV з'ездзе КПБ 26-28 верасня 1961 г. былі абмеркаваны і адобраны праекты праграмы і статута КПСС. Абмеркаванне праграмных дакументаў партыі, маральнага кодэксу будаўніка камунізму зноўку актуалізавала пытанні атэістычнай прапаганды. Таварыш Мазураў адзначыў, што ў многіх партарганізацыях прапаганда носіць не баявы і наступальны характар, а асветніцкі, а ёй трэба надаць ідэйнасць і непрымірымасць. Сакратар Веткаўскага райкама партыі таварыш Белагуб пазнаёміў дэлегатаў з'езду з ходам абмеркавання статута КПСС у раёне, агучыў прапанову настаўніка Прыснянскай СШ Клімакова канкрэтызаваць палажэнне па барацьбе з буржуазнай ідэалогіяй. Апошні падкрэсліў неабходнасць весці барацьбу з перажыткамі рэлігійных поглядаў, прапагандаваць матэрыялістычны светапогляд, быць ваяўнічымі атэістамі [3, л. 169].

У сакавіку 1966 г. прайшоў чарговы XXVI партыйны форум. Ён быў справаздачна-выбарчым. На Беларусі пачалася эпоха таварыша Машэрава. У дакладзе Першы сакратар ЦК КПБ закрануў і праблемы ідэалагічнай работы ў раздзеле: "Узмацненне ідэалагічнай работы – першачарговая задача партыйных арганізацый". Ён падкрэсліў неабходнасць узмацнення барацьбы з перажыткамі мінулага, асаблівую ўвагу удзяляць рабоце з веруючымі – людзьмі, якія, на думку Машэрава, аказаліся ў палоне забабонаў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Першы сакратар патрабаваў тлумачыць няслушнасць "рэлігійных догм", але дапускаць да гэтай работы толькі людзей з цвёрдымі перакананнямі. У якасці няўдачнага прыкладу атэістычнай прапаганды Пётр Міронавіч прывёў прыклад лекцый кандыдата філалагічных навук Зайцава. Вучоны падвёў матэрыялістычную базу пад біблейскую міфалогію. На сваіх лекцыях Зайцаў Ісуса Хрыста атаясамляў з касманаўтам, які лячыў людзей, прапаведаваў новую мараль, а потым на касмічным караблі "узнёсся" на неба. Адвентысты сёмага дня, абураўся Машэраў, прынялі гэтыя разважанні з захапленнем! А партыйныя арганізацыі Мінска не адразу разабраліся з гэтым пытаннем [4, л. 413].

Што характэрна, у гэтым пытанні Машэрава падтрымалі першыя сакратары абодвух заходніх абласцей рэспублікі. Міцкевіч, лідэр гарадзенскіх камуністаў, казаў аб цяжкасцях палітычнай работы, у тым ліку з-за адсутнасці дапаможнікаў па навуковым камунізме. Першы сакратар Брэсцкага абкама Мікуліч падтрымаў свайго калегу. Распавядаючы аб антырэлігійнай прапагандзе ў вобласці, ён палову часу прысвяціў сектантам і дзейнасці іх місіянераў, якія праводзяць малітоўныя сходы на кватэрах і пад адкрытым небам, часта дэманстратыўна спяваюць рэлігійныя гімны. Распавёў Мікуліч аб новай практыцы запісвання на магнітафонныя стужкі рэлігійных радыёперадач з-за мяжы і распаўсюджвання іх сектантамі з дому ў дом. Ён патрабаваў узмацніць класавы падыход да адзнакі гэтых з'яў, прыняць меры па спыненні дзейнасці "рэлігіёзнікаў", а Прэзідыуму Вярхоўнага Савету БССР канкрэтызаваць рэспубліканскае заканадаўства аб рэлігійных культах, прадугледзіць адміністрацыйную і крымінальную адказнасці царкоўнікаў і сектанцкіх прапаведнікаў. Старшыня Камітэта дзяржбяспекі Пятроў у сваім дакладзе канкрэтызаваў бачанне ролі царквы ў ідэалагічнай рабоце. Ён адзначыў, што непасрэдна да ідэалагічных дыверсій імперыялістаў прымыкае падрыўная прапаганда і іншыя варожыя дзеянні рэакцыйнай часткі царкоўнікаў, сектантаў... і другіх элементаў [4, л. 33, 103-104. 177].

На XXVII з'ездзе КПБ 26-28 верасня 1971 г. пасля справаздачнага дакладу таварыша Машэрава выступіла 26 з 35 запісаўшыхся для спрэчак камуністаў. Не былі абыйдзены і праблемы ідэалагічнай работы. У выступленні старшыні КДБ Нікулкіна шмат увагі ўдзялялася выкрыццю імперыялістычнай прапаганды. Да аднаго з метадаў яе ён адносіў рэлігійную дзейнасць і адзначаў, што рэлігійныя цэнтры спрабуюць актывізаваць рэлігійна-сектанцкую дзейнасць, што Ватыкан спрабуе ўмацаваць пазіцыі каталіцкай царквы, дабіваецца стварэння каталіцкай адміністрацыі на Беларусі. Далей ён закрануў, як звычайна, і праблему актыўнасці сектантаў, адзначыў наяўнасць "выпадкаў" іх масавых незаконных "сборышч", на якіх разам з выкананнем рэлігійных абрадаў, абмяркоўваюцца пытанні пашырэння рэлігійнага ўплыву. Асабліва непакоіла старшыню Камітэта дзяржбяспекі імкненне "царкоўнікаў" далучыць да рэлігіі дзяцей і моладзь. Ён падкрэсліў, што нельга абмяжоўвацца толькі адміністрацыйнымі мерамі, якія нярэдка даюць зваротную рэакцыю, а спалучаць іх з актыўнай антырэлігійнай прапагандай [5, л. 92,95]

Такім чынам, на з'ездах 40 – 60-х гадоў, нягледзячы на змены ў кіраўніцтве КПСС, пэўныя адрозненні тактыкі "будаўніцтва камунізму", лінія партыі ў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дачыненні да царквы заставалася нязменнай. Рэлігійныя вераванні лічылі часткай шкоднай буржуазнай ідэалогіі. Асаблівую заклапочанасць ў партыйных вярхоў выклікала рэлігійная сітуацыя ў заходніх абласцях БССР. Найбольшую пагрозу камуністы для сябе бачылі ў дзейнасці каталіцкай царквы і сектантаў. Праваслаўную царкву, як правіла, у выступленнях не ўзгадвалі, але агульная антырэлігійная палітыка была накіравана і супраць праваслаўя.

**Літаратура**


1. НАРБ. – ф. 4п, воп. 2, спр. 213
2. НАРБ. – ф. 4п, воп. 2, спр. 237
3. НАРБ. – ф. 4п, воп. 2, спр. 248
4. НАРБ. – ф. 4п, воп. 2, спр. 251
5. НАРБ. – ф. 4п, воп. 2, спр. 257


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова